Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-03-14



# Бывайце, дарагая Зінаіда Якаўлеўна!



8 сакавіка 2014 г. на 81-м годзе пайшла з жыцця вядучы беларускі этнамузыколаг, вядомы славіст і беларусіст, доктар мастацтвазнаўства Зінаіда Якаўлеўна Мажэйка, імя якой стала знакавым для беларускай навукі і культуры.

У галіне фундаментальнай навукі, з'яўляючыся прадстаўніком сістэмнатыпалагічнай інтанацыйнай школы свайго настаўніка Я. У. Гіпіуса і развіваючы яго ідэі, З. Мажэйка пакінула навуковыя працы, якія ўвайшлі ў «залаты фонд» славянскай музычнай фалькларыстыкі і ў многім вызначылі той высокі ўзровень этнамузыкалогіі, якога гэта навука дасягнула ў другой палове XX — пачатку XXI стагоддзя.

У галіне практычнай фалькларыстыкі Зінаіда Якаўлеўна першай у Беларусі стала сцвярджаць ідэю пра неабходнасць папулярызацыі музычнага фальклору на навуковай аснове і канцэпцыю самадастатковасці музычнай культуры вуснага тыпу. Ёю была распрацавана праграма па аўдыёвізуальнай антрапалогіі, па ўласных сцэнарыях знята сем дакументальных музычна-этнаграфічных кінастужак. Як навуковец з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй З. Я. Мажэйка востра ставіла праблему неабходнасці экалагічнай абароны вясковай народнапесеннай культуры.

Заслугі Зінаіды Мажэйка адзначаны званнем заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1987), Дзяржаўнай прэміяй Беларусі (1994), Прэміяй імя Б. Асаф'ева (1991).

Светлая памяць пра Зінаіду Якаўлеўну назаўсёды захаваецца ў сэрцах яе паплечнікаў і аднадумцаў, тых, каму пашчасціла працаваць разам з гэтай яскравай, неардынарнай асобай на карысць беларускай навукі і культуры.

**Адміністрацыя і супрацоўнікі ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», калегі, сябры**

---

Беларускі саюз музычных дзеячаў глыбока смуткуе з прычыны смерці заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, доктара мастацтвазнаўства, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, члена Праўлення БСМД Зінаіды Якаўлеўны МАЖЭЙКА і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

"Літаратура і мастацтва".
Бывайце, дарагая Зінаіда Якаўлеўна!